# ТУТ МУЗА ЖЫВЕ...

**За больш як 50-гадовую гісторыю свайго існавання Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва выпусціў каля 40 тысяч дыпламаваных спецыялістаў.**





Многія з іх сталі вядомымі ў Беларусі і за яе межамі дзеячамі мастацтва, многія знайшлі сваё прызванне ў тым, каб развіваць культуру і шукаць таленты на сваёй малой радзіме. Хтосьці знайшоў сябе ў навуковай дзейнасці.

Сёння ў БДУКМ спецыялістаў рыхтуюць на 4 профільных факультэтах: культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, музычнага і харэаграфічнага мастацтва, мастацкай культуры, інфармацыйна-дакументных камунікацый. Як расказала **рэктар універсітэта Наталля КАРЧЭЎСКАЯ**, ёсць у складзе ўніверсітэта і Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, 25 спецыяльных і агульнаўніверсітэцкіх кафедр.

— Разнастайнасць сфер дзейнасці дае магчымасць выбару спецыяльнасці для студэнтаў па іх перавагах і інтарэсах, — рэзюмуе яна.

У сённяшнім універсітэце культуры, як і ва ўсіх сучасных ВНУ краіны, навучанне грунтуецца на спалучэнні класічных акадэмічных традыцый і актуальных прафесійных стандартаў. Акрамя ўласна мастацтва, тут студэнты навучаюцца менеджменту, маркетынгу, праву, замежным мовам, IT і псіхалогіі. Адна з адметных асаблівасцяў універсітэта культуры — гэта тое, што падыходы да навучання тут практыкаарыентаваныя.

— Нашы студэнты не проста атрымліваюць тэарэтычныя веды, — тлумачыць Наталля Карчэўская, — але і з першых дзён навучання інтэгруюцца ў рэальнае прафесійнае асяроддзе. Яны не толькі актыўна ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах, але і дапамагаюць іх арганізоўваць — як лакальнага, універсітэцкага, характару, так і маштабныя рэспубліканскія акцыі, фестывалі і дабрачынныя праграмы.

Рэктар ВНУ таксама дадае, што для тых, хто імкнецца да навукі, ёсць магістратура і аспірантура. Прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта налічвае больш як 350 чалавек. Каля 50 % выкладчыкаў маюць вучоныя ступені і ганаровыя званні. Акрамя таго, для правядзення лекцый, практычных заняткаў, круглых сталоў, майстар-класаў у БДУКМ запрашаюцца спецыялісты і выкладчыкі з вядучых замежных універсітэтаў.

Ва ўстанове — сучасныя навучальныя аўдыторыі, спецыялізаваныя харэаграфічныя і тэатральныя класы, а таксама класы традыцыйнага тэкстылю, габелену, батыку, саломапляцення, керамікі і дрэваапрацоўкі. Тут кожны можа знайсці сабе справу па душы незалежна ад таго, на якой спецыяльнасці навучаецца. Маладыя людзі справядліва заўважаюць, што дадатковыя веды і уменні ніколі не бываюць лішнія.

**Алена ВІНАГРАДАВА**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**